# ІГНАТ АБДЗІРАЛОВІЧ І СУЧАСНЫ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ КАНТЭКСТ

***А. І. Бабко,***
*кадыдат філасофскіх навук, дацэнт БДУКМ*

Да найважнейшых задач беларускай культуралогіі на сучасным этапе належыць распрацоўка дзейсных стратэгій захавання і развіцця нашай культуры ў складаным, супярэчлівым, поўным небяспек (але разам з тым і шанцаў) глабалізаваным свеце. Згаданыя стратэгіі могуць адрозніваеца адна ад адной па сваім характары, светапоглядным і метадалагічным падмурку, па скіраваных на іх прасоўванне і папулярызацыю ў грамадстве аргументах. Дадзеная магчымасць абумоўліваецца ў першую чаргу багаццем культурнага жыцця беларускага народа, наяўнасцю ў ім разнастайных тэндэнцый, яго адкрытасцю ў дачыненні да прышласці. Распрацоўка стратэгічных праграм, праектаў і мадэляў разгортвання духоўных працэсаў у беларускай культурнай прасторы, арганічна спалучаная з мадэляваннем сусветных культурных трэндаў і тэндэнцый, здольная, са свайго боку, паспрыяць згаданаму багаццю, і таму неабходна вітаць усё, што робіцца ў адпаведным кірунку. Кожная ідэя, кожная прапанова, кожная канцэпцыя, якімі б яны ні былі – радыкальнымі ці памяркоўнымі, засяроджанымі на шанаванні культурных традыцый ці прасякнутымі духам інавацыйнасці, распрацаванымі на аснове лінейнай ці нелінейнай метадалогіі, – заслугоўваюць уважлівага разгляду і абмеркавання. Сітуацыя проста не можа быць іншай, калі мы ўсур’ёз імкнемся да таго, каб наша нацыянальна-культурная тоеснасць была аплодненай рознасцю, каб яна была багатай на фарбы, шматгалосай і рознабаковай.

Разам з тым, ні ў рамках спробаў тэарэтычнага мадэлявання нашага культурнага развіцця, ні ў культуратворчых практыках на індывідуальным ці агульнанацыянальным узроўні ні ў якім разе нельга апусціцца да эклектычнага, павярхоўнага спалучэння разнароднага матэрыялу, запазычанага з іншых культурных асяродкаў. Эклектычныя культурныя з’явы і формы могуць стварыць ілюзію арыгінальнасці і адметнасці, але толькі ілюзію, бо праз іх сапраўдная адметнасць размываецца і нішчыцца, так што ў выніку рэй вядзе шэрасць і безаблічнасць. У сувязі з гэтым надзвычай важна замацаваць згаданую забарону щ стратэгічных праектах развіцця нашай культуры, надаць ёй трывалы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераканаўчы характар, што патрабуе, безумоўна, распрацоўкі адэкватнай філасофска-метадалагічнай яе асновы.

У сучасных умовах, ва ўмовах надзвычайнай інтэнсіфікацыі міжкультурных узаемадзеянняў, неабходнасць надзейнай антыэклектычнай метадалогіі культуратворчай дзейнасці выяўляецца асабліва выразна. Сёння (як, зрэшты, у пэўнай ступені і ў мінулым) кожны індывід, кожная сацыяльная група, кожны народ зведвае мноства разнастайных культурных уплываў. У сувязі з гэтым можа паўстаць уражанне, нібыта культурнае жыццё ва ўсіх выпадках вызначаецца адсутнасцю нацыянальнага ядра і выступае як пэўнае спалучэнне ідэнтычных па сутнасці характарыстык.

Неабходна адзначыць, што на грунце згаданага ўражання была распрацавана адмысловая філасофская канцэпцыя – канцэпцыя транскультурнасці, якая прэтэндуе на ролю адэкватнай сучасным культурным рэаліям метадалагічнай пазіцыі, здольнай забяспечыць раўнапраўныя, прасякнутыя духам талерантнасці міжкультурныя стасункі [3]. На самай справе, аднак, праз адмаўленне нацыянальна-культурнай адметнасці яна істотным чынам спрыяе разгортванню эклектычных культурных практык і разам з тым вядзе да страты надзвычай важнага вымярэння чалавечага існавання, невычарпальнай крыніцы высокіх духоўных памкненняў, у найвышэйшай ступені дзейснага фактара творчага засваення рэчаіснасці. Можна прывесці мноства фактаў з гісторыі развіцця нашай культуры, што пацвярджаюць каласальнае значэнне нацыянальных, патрыятычных пачуццяў для самаразвіцця чалавека, для яго крэатыўнай дзейнасці (ці не найяскравейшы з іх – Алесь Гарун, жыццё і творчасць якога далі А. Адамовічу нагоду весці гаворку пра «нацыянальны эрас» [2, с. 1085]).

Ні ў якім разе, аднак, нельга ігнараваць і той момант, што надзвычай моцны эмацыйны складнік, звязаны з прыналежнасцю да пэўнай этнічнай супольнасці, можа дэгенераваць да ўзроўню агрэсіўнага, прымітыўнага нацыяналізму і разам з ім зрабіцца прычынай міжнацыянальнай варожасці, канфліктаў і войнаў (што выглядае як аргумент на карысць культуралагічных праектаў, якія адмаўляюць ідэю нацыянальна-культурнай адметнасці). Тым не менш такое разгортванне падзей зусім не з'яўляецца непазбежным і супраць яго неабходна ўпарта і мэтанакіравана змагацца. Таму выяўленне механізмаў, што супрацьдзеянне згаданай дэградацыі павінна належаць да прыярытэтных кірункаў у тэарэтычнай і практычнай дзейнасці, скіраванай на захаванне і развіццё беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта падкрэсліць, што пры вырашэнні задач, звязаных з распрацоўкай канцэптуальных асноў адметнай культуратворчасці нашага народа, сучасная беларуская культуралагічная думка можа і павінна абаперціся на багатую нацыянальную інтэлектуальную традыцыю. Да найважнейшых у гэтым плане духоўных яе набыткаў належыць, безумоўна, выдатнае эсэ Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», якое і ў сучасных умовах застаецца неад’емнай тэарэтычнай крыніцай для абгрунтавання эфектыўных, здольных супрацьстаяць эклектычнай плыткасці культуратворчых стратэгій.

Такі стан рэчаў абумоўлены цэлым шэрагам момантаў і найперш тым, што І. Абдзіраловіч недвухсэнсоўна адзначыў неабходнасць універсальнага агульначалавечага пачатку для плённай, выніковай нацыянальнай культуратворчасці. У гэтай сувязі філосаф заклікаў беларускую інтэлектуальную эліту і ўвесь беларускі народ кіравацца прыкладам Скарыны, у духоўных пошуках якога ён вылучыў найперш палымянае памкненне да рэалізацыі агульначалавечага духа ў адмысловым, непаўторным выглядзе, у «беларускай скуры» [1, с. 9]. Універсальнае і нацыянальнае ўвогуле непарыўна знітаваны адно з адным, нацыянальная адметнасць належыць да неед’емных формаў здзяйснення агульначалавечага пачатку (філосаф даводзіць, што «разам зь беларушчынай мы трацім і лепшую частку чалавечнасьці» [1, с. 16]). Дадзеныя ідэі маюць грунтоўнае тэарэтычнае і практычнае значэнне ў сучасных умовах.

У першую чаргу ў гэтым плане неабходна адзначыць, што ўласцівы ім творчы патэнцыял дазваляе разглядаць іх у якасці філасофска-метадалагічнай альтэрнатывы філасофскім канцэпцыям, якія патураюць эклектычным культурным практыкам.

Акрамя таго, з палажэння пра глыбокую ўзаемаабумоўленасць агульначалавечага і нацыянальнага пачаткаў цалкам лагічна вынікае надзвычай моцны аргумент супраць згаданага вышэй «дэгенераванага» нацыяналізму: іншая адметнасць – гэта іншы спосаб здзяйснення субстанцыянальнага, радавога прынцыпу, які яднае розныя нацыянальныя культуры. Менавіта таму і фармулюе І. Абдзіраловіч забарону на «беларускі местыянізм» [1, с. 17], што азначае па сутнасці неабходнасць змагацца за ўсталяванне сістэмы раўнапраўных міжкультурных стасункаў, за рэалізацыю іх дыялагічнай мадэлі.

Той момант, што якраз такая мадэль стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для ўзаемаўзбагачэння культур (а таму і для іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самаразвіцця), падаецца відавочным. Тым не менш яна не выключае адназначна эклектычных культурных практык, механічнага перанясення створаных іншымі народамі культурных формаў на ўласную глебу (рабства можа быць дабраахвотным, дабраахвотнай можа быць адмова ад свайго, уласнага, непаўторнага). Найважнейшай передумовай унікнення такога кшталту культурных паводзінаў з'яўляецца глыбокае адчуванне і яснае разуменне сваёй нацыянальнай адметнасці, звязанае з няспынным пошукам яе першапачатковай, адвечнай падставы. Менавіта на такі падыход нацэльвае нас тэкст І. Абдзіраловіча – падыход плённы і перспектыўны, хоць у самога філосафа ён прыводзіць, магчыма, да небясспрэчнага выніку, да высновы, згодна з якой першаснай, субстанцыянальнай падставай нашай спецыфікі з'яўляецца язычніцкі светапогляд (дадзеная пазіцыя, зрэшты, зусім не выглядае нежыццяздольнай, яна даказала сваё права на існаванне: дастаткова ўзгадаць тую плыню ў сучаснай беларускай культуралагічнай думцы, якую прадстаўляе суполка «Крыўя»).

Выразная, моцная ўніверсальная і нацыянальная самасвядомасць пэўнага народа дазваляе яму ўпэўнена пачувацца ў коле міжкультурных узаемадзеянняў, бо ў выніку толькі пры такой умове ён можа па-сапраўднаму зразумець іншыя культуры і, дзякуючы гэтаму, паглыбіць сваё ўласнае самаразуменне і атрымаць новыя імпульсы для сваёй уласнай культуратворчасці. Зварот да духоўных набыткаў іншых народаў, да агульначалавечай культуры выглядае ў такой сітуацыі натуральным і неабходным. Дадзены момант знаходзіць яскравае выяўленне і ў даследаваннях І. Абдзіраловіча, які пры абгрунтаванні прапанаванай ім культуратворчай праграмы цалкам натуральна і лагічна звяртаецца да скарбаў сусветнай філасофскай думкі (у гэтым плане, дарэчы, ён засяроджваецца найперш на класічнай дыялектыцы і на філасофіі жыцця – пазіцыя, якую таксама ні ў якім разе нельга назваць бесперспектыўнай).

Такім чынам, пры вырашэнні складаных пытанняў і праблем, грунтоўна важных для развіцця беларускай культуры ва ўмовах глабалізацыі, пры распрацоўцы тэарэтычных праектаў і мадэляў згаданага развіцця сучасная беларуская культуралагічная думка мае надзейнае апірышча ў нашай нацыянальнай духоўнай традыцыі, творчыя набыткі якой (у найвышэйшай ступені важкія, як паказвае прыклад І. Абдзіраловіча) патрабуюць самай пільнай увагі і сур'ёзнага вывучэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*1. Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

*2. Адамовіч, А.* Да гісторыі беларускай літаратуры / А. Адамовіч. – Менск : Выд. Зьміцер Колас, 2005. – 1464 с.

*3. Welsch, W.* Transculturality – the Puzzling Form of Cultures Today / W. Welsch // Spaces of Culture: City, Nation, World ; Ed. By M. Featherstone and S. Lash. – London : Sage, 1999. – P. 194–213.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ